№ 184 (766)

Серада, 6 кастрычніка 1999 г.

Выдаецца з ліпеня 1995 г. на беларускай і рускай мовах

Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень

Кошт: у кіёсках і крамах — 25000 руб., па падпісцы — 18000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб Колас

Цель переговоров — проведение свободных, справедливых, международно признанных выборов в Беларуси

Консультативно-наблюдательная группа (КНГ ОБСЕ) в Беларуси отвергает необоснованные утверждения Верховного Совета 13-го созыва. КНГ ОБСЕ не выдвигала никаких требований оппозиции. Наоборот, она предоставляет все необходимые условия для проведения дискуссий между оппозиционными группами, при необходимости обеспечивая их экспертную поддержку и предлагая компромиссные формулировки в документах противоречивого содержания. КНГ уполномочена выступать в качестве посредника на переговорах между правительственной стороной и оппозицией. Мандат на эти действия был одобрен 54 странами — членами ОБСЕ. Целью переговоров является проведение в 2000 году свободных, справедливых, международно признанных парламентских выборов в Беларуси. В повестку дня переговоров, получившую принципиальное одобрение обеих сторон, входит избирательный кодекс, доступ групп и кандидатов от оппозиции к средствам массовой информации и функции избираемого парламента.

ОБСЕ неизменно утверждала, что переговорам должно предшествовать осуществление мер по установлению климата доверия. Политически мотивированные преследования газет через финансовые и контрольные органы, равно как и политически мотивированное уголовное преследование независимых лидеров, несовместимы с реальными переговорами. Поэтому ОБСЕ неоднократно просила об освобождении бывшего премьер-министра Михаила Чигиря, а также официально предложила правительственной стороне предоставить подробную информацию об обстоятельствах исчезновения Виктора Гончара. Ведется постоянное наблюдение за ходом рассмотрения других дел, которые ОБСЕ считает политически мотивированными.

Экспертные группы, назначенные правительственной стороной и оппозицией, уже обсудили ряд предварительных вопросов, относящихся, в частности, к регламенту переговоров и доступу к средствам массовой информации до и во время переговоров. Был достигнут определенный прогресс. Предложенные формулировки должны способствовать продвижению всех сторон, заинтересованных в переговорах, к достижению согласия. Помимо осуществления мер по установлению климата доверия, заключение предварительного соглашения по этим вопросам является еще одним условием начала успешных переговоров. Целью данных соглашений является не решение всех вопросов, а создание условий для их обсуждения.

В свете вышесказанного КНГ ОБСЕ просит все стороны воздерживаться от конфронтационных действий и возобновить переговоры в духе сотрудничества и взаимного уважения.

Ханс-Георг ВИК,
руководитель Группы ОБСЕ в Беларуси.

Большасць мінчан супраць утварэння саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі

Падчас чарговага апытання грамадскай думкі, праведзенага 28—30 верасня ў Мінску сацыялагічнай службай "Зеркало" інфармацыйнай кампаніі БелаПАН, шасцістам жыхарам беларускай сталіцы ва ўзросце ад 18 гадоў і старэй было прапанавана адказаць на пытанне "КАЛІ Б СЁННЯ АДБЫЎСЯ РЭФЕРЭНДУМ АБ УТВАРЭННІ САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ БЕЛАРУСІ І РАСІІ, ВЫ ГАЛАСАВАЛІ Б "ЗА" АБО "СУПРАЦЬ"?". Больш за палову — 56 працэнтаў — апытаных мінчан выказаліся супраць аб'яданння. 21 працэнт гатовы прагаласаваць за ўтварэнне саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. 14 працэнтаў рэспандэнтаў устрымаліся б ад галасавання. Астатнім (9 працэнтаў) было цяжка адказаць.

З тых, хто адказаў на пытанне "У СУВЯЗІ З ЧЫМ ВЫ НЕ ПАДТРЫМЛІВАЕЦЕ ЎТВАРЭННЯ САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ БЕЛАРУСІ І РАСІІ?", больш за палову з іх лічаць: пасля аб'яднання беларускія юнакі змушаныя будуць несці вайсковую службу ў "гарачых" кропках Расіі (59 працэнтаў) і ў Беларусі, як і ў Расіі, узнікне пагроза тэрарыстычных актаў (54 працэнты). 43 працэнты рэспандэнтаў баяцца павелічэння затрымак з выплатай зарплат і пенсій, а 35 працэнтаў — страты Беларуссю дзяржаўнага суверэнітэту. Кожны пяты апытаны мінчанін апасаецца, што ў выніку аб'яднання з Расіяй узрасце інфляцыя (21 працэнт), Беларусь ператворыцца ў правінцыю Расіі (21 працэнт), падаражэюць тавары (21 працэнт), а таксама што Беларусь страціць сваю нацыянальную самабытнасць, культуру і мову (20 працэнтаў). З'яўлення праблем з працаўладкаваннем баяцца толькі 6 працэнтаў апытаных мінчан.

Леанід МІХЕЙЧЫКАЎ.

Нацыянальны банк Беларусі не здолеў дамовіцца з Цэнтральным банкам Расіі па пытаннях аб'яднання грашовых сістэм і ўвядзення адзінай валюты

Нацыянальны банк Беларусі не здолеў пакуль дамовіцца з Цэнтральным банкам Расіі адносна механізму аб'яднання грашовых сістэм дзвюх дзяржаў і ўвядзення адзінай валюты. Пра гэта, выступаючы 4 кастрычніка перад членамі так званага Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, паведаміў галоўны банкір краіны Пётр Пракаповіч. Паводле ягоных слоў, пасля пасяджэння Выканкама Саюза Беларусі і Расіі 17 ліпеня былі распрацаваныя два варыянты ўвядзення адзінай валюты — беларускі і расійскі. Згодна з беларускім варыянтам, адзіным эмісійным цэнтрам павінен быць валютны савет, у які ўвойдуць прадстаўнікі Нацбанка Беларусі, Цэнтрабанка Расіі, а таксама міністэрстваў фінансаў і эканомікі дзвюх краін. Рашэнні валютнага савета павінны насіць абавязковы характар для Нацбанка і Цэнтрабанка, у тым ліку па пытаннях эмісіі і асноўных накірункаў грашова-крэдытнай палітыкі. Расійскі безнаяўны рубель, у адпаведнасці з беларускім варыянтам, становіцца "саюзным рублём". Прычым замена беларускіх безнаяўных рублёў на расійскія безнаяўныя павінна распачацца ўжо сёлета і праходзіць паступова, на працягу некалькіх гадоў; затым — таксама паступова, на працягу доўгага перыяду, аналагічны працэс будзе адбывацца з наяўнымі рублямі.

Пазіцыя ж расійскага боку, паведаміў П.Пракаповіч, застаецца ранейшай: ён настойвае на тым, каб адзіным эмісійным цэнтрам быў Цэнтрабанк Расіі, і каб пераход на безнаяўныя расійскія рублі ажыццяўляўся не паступова, а адразу — на працягу аднаго дня, напрыклад, праз 3—5 гадоў.

"На гэта мы не можам пагадзіцца, таму што гэта супярэчыць саюзнаму дагавору, і мы трапляем у поўную залежнасць ад расійскага боку", — заявіў старшыня праўлення Нацбанка. Менавіта таму, паводле ягонага сцвярджэння, на апошнім пасяджэнні Выканкама Саюза Беларусі і Расіі 8 верасня дадзенае пытанне было пастаўлена перад новым кіраўніком расійскага ўраду Уладзімірам Пуціным. Банкам было дадзена даручэнне прадоўжыць пошук кампрамісу. "Знайсці кампраміс будзе вельмі складана, але не таму, што з Цэнтрабанкам РФ складана дамовіцца, а таму што ў Расіі зараз час безуладдзя і Цэнтрабанку складана на сябе прымаць асноватворныя рашэнні", — сказаў П.Пракаповіч.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ, БелаПАН.

Крыўдна!

Хочацца напіцца ад такога жыцця, ды гарэлка знікла, *альбо* Пра адзін дзень вяскоўца

Быў звычайны восеньскі дзень. Асноўныя работы на прысядзібным участку зроблены. Трэба думаць пра наступны год. Вырашыў наладзіць касу. Спачатку трэба адкляпаць. Цэлую гадзіну дзёўб, а толку няма.

Успомніў, што Кацярына Адамаўна, гаспадыня крамы, на пытанне, чаму даволі танныя косы людзі не купляюць, адказала: "Яны не адбіваюцца". Цяпер зразумеў, што грошы выкінуў на сметнік.

З хаты выйшла жонка і паведаміла, што адключыўся халадзільнік, бо прапала электрычнасць. Паглядзеў пробкі, праводку — усё нармальна. Значыць, адключылі лінію. Не першы раз будзем сядзець без святла і тэлеперадач.

Паглядаю ў бок вуліцы. Сёння павінны прывезці газавы балон. Не прывезлі. Мабыць, зноў з газам перабоі. Яшчэ тыдзень як мінімум прыйдзецца паліць у печы.

Сеў на веласіпед і паехаў у суседнюю вёску: трэба заплаціць за электраэнергію. Дзверы ашчаднай касы зачынены. Вісіць аб'ява: "Сёння мая чарга пасвіць кароў". Пасвіць кароў — справа святая. Але крыўдна, што паўтары гадзіны патраціў марна.

Заглянуў у краму. У былыя часы на цэнтральнай сядзібе калгаса амаль усё можна было купіць. Цяпер асартымент бедны. Мінеральная вада каштуе каля 100 тысяч. Успомніў, што сёння раніцай мой сваяк Аляксандр Савіч запрашаў прысці па малако. Кажа, калгас плаціць за літр 30 тысяч, таму няма сэнсу здаваць, хай лепш жонка малаком свіней корміць.

Днямі да мяне абяцаў заехаць сябра. Традыцыя: без пляшкі не абысціся. Запытаў у краме наконт гарэлкі. Прадаўшчыцы і пакупнікі дружна засмяяліся. Як аказалася, гарэлкі даўно няма. Кажуць, спіртзаводы прастойваюць, няма сыравіны.

Колісь мая маці казала: "Калі едзеш, сынок, да нас, то нічога не купляй, а хлеб прывозь". Цяпер сам я жыву ў вёсцы і па звычцы хлеб заўсёды вязу з горада. На мінулым тыдні ў Мінску купіў "Прыдняпроўскі" хлеб па 23 тысячы. А ў вясковай краме хлеб, горшы па якасці, каштуе 54 тысячы. Узнікае пытанне: чаму заробкі і пенсіі вяскоўцаў самыя нізкія, а цэны на тавары для іх самыя высокія? Такую палітыку зразумець немагчыма. А людзі маўчаць.

Вярнуўся дахаты і стаў секчы дровы. Праз нейкі час пайшоў дождж. Самы час пачытаць газеты. Учора пошту не прывозілі, то сёння павінна быць. Але і сёння паштовая скрынка пустая. Раней прывозілі праз дзень, а цяпер праз два, а то і радзей. Намеснік старшыні райвыканкама абяцаў вырашыць гэтую праблему. Не атрымалася. Мабыць, улады не хапае.

Трэба ехаць зноў у райцэнтр. Пасля абеда рушыў да прыпынку. Доўга чакаў аўтобуса. Патэлефанаваў дыспетчару аўтастанцыі. Там патлумачылі, што рэйс аўтобуса ў нашу вёску адмянілі: няма паліва. Я вярнуўся дадому, а маладыя, каму заўтра на працу ў Глуск ці ў Бабруйск, пабеглі шукаць транспарт.

Вось якое жыццё настала: аўтобуса няма, газу няма, пошты няма, электрычнасці няма. Ад такога жыцця хоць бы напіцца, дык і гарэлкі няма.

Чамусьці на памяць прыйшла аповесць А.Салжаніцына "Адзін дзень з жыцця Івана Дзянісавіча". Там ён апісаў дзень жыцця зняволенага ў сталінскім лагеры. Успомнілася таму, што жыццё сучаснай вёскі мала чым адрозніваецца ад жыцця ў зоне. Тут канчаткова ўсталявана прыгоннае права.

Пайшоў па хатах. Стаў тлумачыць людзям, што так жыць нельга. Нас рабуюць і зневажаюць, бо мы запалоханыя і раз'яднаныя. Толькі арганізаваныя людзі маюць сілу. Толькі аб'яднаўшыся, можна абараніць вёску. І прапанаваў запісацца ў Беларускі народны фронт "Адраджэнне". Чатырнаццаць чалавек напісалі заявы. Моўчкі. Але гэта ўжо іншае маўчанне — маўчанне перад навальніцай.

Яўген ЛУГІН,
вёска Барбароў Глускага раёна.

Акции

Притеснение молодежи на Беларуси вызвало негативную реакцию молодежных организаций на Украине

Отказ в регистрации Белорусской ассоциации молодых политиков вызвал негодование в молодежной политической среде Украины. В ее столице перед зданием Посольства Беларуси состоялся пикет протеста. Пикетчики вручили первому секретарю посольства обращение следующего содержания:

"Мы, представители общественных, молодежных и политических организаций Украины,

руководствуясь Всеобщей декларацией прав человека, признавая право граждан на свободу объединений и ассоциаций, выходя из чувства ответственности и солидарности,

расцениваем факт отказа в перерегистрации Белорусской Ассоциации молодых политиков (БАМП) как начало процесса вытеснения из правового поля Беларуси демократических общественных организаций;

требуем от Министерства юстиции Республики Беларусь пересмотра данного решения;

призываем правительство Республики Беларусь немедленно применить методы, которые исключат возможность использования процесса перерегистрации общественных организаций в качестве средства борьбы с инакомыслием;

призываем правительство и парламент Украины, международные правозащитные организации использовать свой авторитет для того, чтобы заставить белорусскую власть уважать права и свободы общественных объединений.

Подписали обращение 17 молодежных общественных организаций Украины, а непосредственно в пикете с белорусским бело-красно-белым флагом стояли представители шести организаций. Их плакаты "Требуем от Министерства юстиции Республики Беларусь зарегистрировать БАМП", "Беларусь, Воля, Гончар", "Нет политическим преследованиям" показаны по украинскому телевидению.

Валерий АЛЕКСЕЕВ.

Надвор'е

6—7 кастрычніка — воблачнае з праясненнямі надвор'е; 6-га — па захадзе, 7-га — месцамі па краіне — дажджы. Вецер паўднёва-ўсходні, 6—11 м/с. Тэмпература паветра ўначы — +8...+13, удзень — +15...+20; 6-га — па ўсходзе да +26.

Дзяржкамдруку прызнаў несапраўднымі пасведчанні аб рэгістрацыі дзевяці выданняў, у тым ліку — газеты "Наша Свабода" і часопіса "Кур'ер"

Дзяржаўны камітэт па друку Рэспублікі Беларусь прызнаў несапраўднымі пасведчанні аб рэгістрацыі дзевяці выданняў, у тым ліку — газеты "Наша Свабода", якую планавалася выдаваць замест нядаўна закрытых "Навін" і часопіса "Кур'ер", заснавальнікам якога выступае былы галоўны рэдактар газет "Свабода" і "Навіны" Ігар Гермянчук.

У загадзе Дзяржкамдруку адзначаецца: "выбарачная праверка матэрыялаў рэгістрацыі перыядычных выданняў выявіла, што пры ўтварэнні шэрагу друкаваных сродкаў масавай інфармацыі не былі прадстаўленыя дакументы аб узгадненні размяшчэння (месцазнаходжанне заснавальніка, рэдакцыі, выдаўца і распаўсюджвальніка — БелаПАН.) перыядычных выданняў з адпаведнымі мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі". За парушэнні, дапушчаныя пры рэгістрацыі перыядычных выданняў, абвешчана папярэджанне начальніку ўпраўлення прававога забеспячэння Ігару Ковалю і вымова — начальніку аддзела рэгістрацыі і ліцэнзавання Віктару Гурэцкаму. Апрача таго, старшыня Дзяркамдруку М.Падгайны загадаў у "двухтыднёвы тэрмін правесці праверку рэгістрацыйных спраў на прадмет строгага выканання заканадаўства аб друку пры рэгістрацыі друкаваных СМІ".

У размове з карэспандэнтам БелаПАН В.Гурэцкі паведаміў, што, згодна са змяненнямі і дапаўненнямі, унесенымі ў закон "Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі" 8 студзеня 1998 года, да заявы аб рэгістрацыі выдання, у ліку іншых дакументаў, павінны прыкладацца матэрыялы аб узгадненні размяшчэння дадзенага СМІ з адпаведнымі мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі. Раней існавала практыка, пры якой Дзяржкамдруку не патрабаваў такіх дакументаў ад заснавальнікаў СМІ, што рэгістраваліся ў Мінску.

Каменціруючы ўзнікшую сітуацыю, Мікалай Халезін — намеснік галоўнага рэдактара газеты "Наша Свабода", якую мусілі выпускаць замест нядаўна закрытых "Навін", заявіў: "гэта звычайны, нармальны ход улад, калі яны знайшлі падставу, каб не дазволіць з'яўленне нашай газеты, і ніякай юрыдычнай падкладкі тут шукаць не трэба". Гаварыць аб плане далейшых дзеянняў рэдакцыі М.Халезін не палічыў неабходным.

Марат ГАР[illegible]ВЫ,
БелаПАН.

Кіраўніцтва БНФ заяўляе аб тым, што "любыя спробы ліквідацыі незалежнасці Беларусі сустрэнуць жорсткі і скаардынаваны адпор партый, арганізацый і грамадзян"

Кіраўніцтва Беларускага народнага фронту "Адраджэнне" і партыі БНФ заклікае грамадзян Беларусі ўзяць удзел у "Маршы Свабоды", які пройдзе ў Мінску 17 кастрычніка.

Заклік да ўдзелу ў "Маршы Свабоды" змяшчаецца і яшчэ ў адным дакуменце, прынятым соймам БНФ, — у заяве партыі БНФ "Аб абароне незалежнасці Рэспублікі Беларусь". У ім адзначаецца рэальная пагроза, якая навісла над незалежнасцю Беларусі. "Гульня вакол "усенароднага абмеркавання саюзнага дагавора" сведчыць, што згода на перамовы з апазіцыяй пад эгідай АБСЕ — усяго толькі шырма для захавання дыктатуры і дыктатара, — адзначаецца ў заяве. — Спектаклі з крытыкай так званага "саюзнага дагавора" ... нікога не падмануць, яны разлічаныя толькі на тое, каб вытаргаваць сабе ў Крамлі месца пацяплей".

Аўтары заявы папярэджваюць, што любыя спробы ліквідацыі незалежнасці Беларусі сустрэнуць жорсткі і скаардынаваны адпор партый, арганізацый і грамадзян краіны.

Генадзь БАРБАРЫЧ.

Пляшка падаражэла

Сёмы раз сёлета ў Беларусі ўзраслі цэны на белую гарэлку. З 1 кастрычніка паўлітровая "вінтавая" бутэлька гарэлкі "Крышталь-100" каштуе 413 тысяч рублёў (раней — 347 тысяч), "Белая Русь" і "Крышталь-люкс" — 429 тысяч рублёў (раней — 361 тысяча). Паводле звестак БелаПАН, 20-працэнтнае падаражэнне гарэлкі стала вынікам росту на 40 працэнтаў акцызу на алкагольную прадукцыю.

Нягледзячы на самае значнае сёлета падаражэнне (папярэднія не перавышалі 15 працэнтаў), гарэлка беларускай вытворчасці застаецца вострадэфіцытным прадуктам. 4 кастрычніка ў мінскіх крамах за ёю назіраліся доўгія чэргі; у шмат якіх гандлёвых кропках беларускай сталіцы гарэлка параней шаму адсутнічае.

Дзмітрый УЛАСАЎ.

Дефицит водки начался еще в конце августа. В сентябре в ряде областей, в частности, Гродненской и Брестской, введено нормирование ее продажи. По оценкам специалистов, дефицит связан с нехваткой сырья на спиртзаводах, а также с ажиотажным спросом на продукт.

Фото IREX/ProMedia.

Пр. Антаніны, Андрэя, Івана, Інакенція, Пятра. К. Артура, Брунона.

КАСТРЫЧНІК

6

'99 СЕРАДА

Усход 6.21
Захад 17.34
Даўж. дня 11.13

Маладзік
9 кастрычніка
Усход 3.30
Захад 17.53

Беларуская дыяспара ў Сіднеі адмовілася ад супрацоўніцтва з Нацыянальным алімпійскім камітэтам Беларусі падчас правядзення XVII летніх алімпійскіх гульняў

Пра гэта журналістам паведамілі генеральны сакратар НАК Анатоль Іваноў і намеснік міністра спорту і турызму, кіраўнік беларускай дэлегацыі на Алімпіядзе Аляксандр Грыгораў, якія некалькі дзён таму вярнуліся з Сіднею, дзе праходзіў семінар шэфаў місій і генеральных сакратароў НАК.

Па іх словах, беларуская дыяспара прыняла такое рашэнне па палітычных матывах, заявіўшы аб непрыманні цяперашніх афіцыйных сімвалаў сваёй гістарычнай радзімы — герба, гімна і сцягу. Як заявіў А.Іваноў, толькі для таго, каб сустрэцца з ім і А.Грыгоравым, кіруючы орган сіднейскай дыяспары правёў спецыяльнае галасаванне, на якім прапанова аб неабходнасці сустрэчы прайшла з перавагай у адзін голас. У той жа час, напрыклад, украінская дыяспара ў Сіднеі выказала гатоўнасць аказаць былым суайчыннікам усямерную маральную і матэрыяльную падтрымку.

Дзмітрый УЛАСАЎ.

Из первых уст

О Викторе Гончаре рассказывают сестры

Виктор Гончар — личность неординарная. Его выступления на сессиях Верховного Совета 12-го созыва широко известны, поскольку в допрезидентские времена ход сессии транслировался по телевидению. О деятельности Виктора Иосифовича в Верховном Совете 13-го созыва избиратели знают опосредованно — через те ушаты политической грязи, которые вот уже несколько лет выливают на него многие средства массовой информации. Причем не только со стороны правящего режима. Достается этому политику и от оппозиционных партий, лидеры которых видят в нем главного соперника на пути к избирательным урнам.

Тем не менее именно Виктора Гончара направляли коллеги по парламенту на самые важные политические мероприятия, возглавить которые никто другой не решался. Именно он принял Центризбирком в критический для нашей страны период референдума 1996 года и был свергнут с этой должности режимом с применением вооруженного охранного отряда. Именно Гончару поручили создать и возглавить Центризбирком в период президентской избирательной кампании 1999 года. В тот раз Виктора Иосифовича силами спецчастей режима водворили на нары. Именно Виктору Гончару доверили руководить законодательным органом Беларуси после прекращения легитимности головы нынешней вертикали. Куда "спецы" водворили политического лидера на этот раз, пока неизвестно.

А каков этот видный политик в кругу семьи?

Рассказывают сестры Виктора Гончара Галина и Тамара, приехавшие в столицу из провинции с целью защитить имя своего брата, поведать о нем правду:

"Виктор из рабочей семьи. Отец, рабочий торфобрикетного завода, умер в 1991 году в 64-летнем возрасте. Мать — рабочая электросборочного производства. Ныне — пенсионерка, ей 72 года.

Виктор — самый лучший ученик в истории школы поселка Первомайский, расположенного в семи километрах от города Лида. В школьные годы у него вообще не было четверок. Шел всегда впереди программы, еще учеником мог при необходимости спать три-четыре часа в сутки.

Феноменальная работоспособность позволила блестяще учиться и в университете. Время свое Виктор рассчитывал буквально по минутам. К примеру, на любимый футбол выделял всего один час и ни минутой больше. Во время учебы в университете подрабатывал грузчиком.

Способности Виктора были оценены — сразу же после окончания института он был принят в аспирантуру. В 25 лет защитил диссертацию. Занимаясь в аспирантуре, читал публичные лекции, которые пользовались большим успехом. Тщательно работал над своей речью. Всегда находился в окружении друзей и товарищей. Попасть в этот круг стремились многие.

Виктор не способен на нехорошие поступки. Никогда не прятался от опасности и старался не причинять боль близким. Обвинение его в грязной игре — имитирование похищения - подлость со стороны власть имущих".

Сестра Виктора Гончара Тамара — учительница в Копыле. Брат Иосиф — инженер комбината стройматериалов в Лиде. Сестра Галина — банковская служащая, проживает вместе с матерью в поселке Первомайский. Зарплата Тамары, учительницы первой категории с 20-летним стажем работы и при полной часовой нагрузке, — 12 долларов.

Галина и Тамара просто не знают, каким словом назвать измышления, прозвучавшие с экрана Белорусского телевидения о том, что близкие Гончара отказываются от контактов со следствием. Ведь они готовы вступить в контакт с любым, кто может пролить свет на обстоятельства исчезновения Виктора. **Телефон в г.Копыле: 5-45-42, в г.Лиде: 9-32-40, 4-15-03.**

Валерий ЩУКИН.

Анатоль Лябедзька абмеркаваў з уладамі ЗША сітуацыю ў Беларусі

Дэпутат Вярхоўнага Савета Беларусі 13-га склікання Анатоль Лябедзька ў Вашынгтоне быў прыняты ў Дзяржаўным дэпартаменце і Савеце нацыянальнай бяспекі Злучаных Штатаў. Як паведамілі БелаПАН у прэс-цэнтры Беларускай асацыяцыі маладых палітыкаў (БАМП), падчас гутаркі з А.Лябедзькам многія сенатары і кангрэсмены выказалі жаданне сустрэцца з прадстаўнікамі "новай хвалі" беларускай палітыкі. Абмяркоўваўся шырокі спектр праблем: сітуацыя ў Беларусі, маючы адбыцца саміт кіраўнікоў дзяржаў — членаў АБСЕ ў Стамбуле, перамоўны працэс, навучальныя праграмы для моладзі і многія іншыя пытанні.

У цэнтры ўвагі гэтых сустрэч знаходзіліся лёсы беларускіх палітзняволеных і дзеячаў апазіцыі, якія зніклі. А.Лябедзька перадаў у адміністрацыю прэзідэнта ЗША зварот жонкі першага намесніка старшыні Вярхоўнага Савета Віктара Ганчара, які бясследна знік 16 верасня, Зінаіды Ганчар на імя Біла Клінтана. Абмяркоўвалася таксама магчымасць сустрэчы жонкі былога прэм'ер-міністра Міхаіла Чыгіра, які знаходзіцца цяпер пад арыштам, Юліі Чыгір з Хілары Клінтан на міжнародным форуме, які адбудзецца ў Ісландыі.

На сустрэчах падкрэслівалася, што амерыканскія ўлады ўсур'ёз заклапочаныя знікненнем людзей у Беларусі, праследам палітычных апанентаў і маюць намер жорстка патрабаваць ад беларускай выканаўчай улады строгага выканання правоў чалавека ў адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі.

Наталля КУЛАГІНА, БелаПАН.

Рыба гниет с головы

Светская хроника любанской "вертикали"

Говорят, что кадры решают все. Вспомнив сию мудрость, наши самые высокие власти решили укрепить руководство Любанского райисполкома, председатель которого не совсем вписывался в образ идеального руководителя по причине того, что имел один весьма серьезный порок — был слишком интеллигентен. И вот 27 мая позапрошлого года ему на смену пришел подлинный представитель трудящегося крестьянства — Иван Макаревич. Именно на него руководство республики и области возложило заботу о наведении порядка и укреплении дисциплины, об улучшении трудовых показателей промышленных предприятий, организаций, колхозов и совхозов, о повышении жизненного уровня любанчан.

Но главой района Макаревичу довелось быть недолго. Летопись его героических свершений полна добрыми делами во благо народа. К которому в первую очередь относился он сам вместе со своими многочисленными родственниками.

Чтобы читатели с самого начала не заподозрили меня в некой предвзятости, в начале своего повествования я сошлюсь на бесстрастные цифры. Перед вами таблица показателей по основным видам жизнедеятельности любанского хозяйственного организма по состоянию на 1996 год (до прихода Макаревича) и на 1998 год, когда он уже успел облагодетельствовать район своим мудрым руководством.

	1996 г.	1998 г.
Рентабельность сельского хозяйства (в процентах)	14	6,6
Производство мяса (тысяч тонн)	6,6	5,1
Производство молока (тысяч тонн)	33,2	31,1
Валовой сбор зерна (тысяч тонн)	53,2	40,7
Урожайность зерновых (центнеров с га)	21,3	15,1
Заготовлено кормов (к.е. на голову скота)	15,2	12,5
Производство крахмала (тонн)	777	414
Производство масла животного (тонн)	830	801
Производство кирпича силикатного (млн. штук)	77	69
Отлов рыбы (тонн)	1022	377

Ну а теперь, что называется, ближе к кошелькам любанчан. О каком повышении жизненного уровня можно вести речь, если в январе текущего года в среднем по республике заработная плата работников промышленности, например, составляла 9,582 миллиона рублей, а на Любанщине — только 4,628 миллиона (в сельском хозяйстве вообще полтора)?!

Выходит, руководство района со своей задачей не справилось. Возникает закономерный вопрос: чем же оно занималось? В некоторой степени постараемся на этот вопрос ответить.

Итак, 27 мая 1997 года председателем Любанского районного исполнительного комитета стал бывший председатель правления колхоза "Парижская коммуна" соседнего Солигорского района Иван Михайлович Макаревич. Ему, как и любой новой "метле", чтобы "мести" по-новому, понадобилась своя команда. Иван Михайлович и занялся ее формированием.

Начал с того, что на должность заместителя начальника отдела внутренних дел райисполкома устроил своего кума Александра Челевича (ныне покойного). Тот был участковым милиционером в "Парижской коммуне" во времена председательствования Макаревича.

Первым заместителем председателя райисполкома, начальником управления сельского хозяйства и продовольствия был назначен бывший председатель правления колхоза "Дружба" Николай Есмантович. Он был большим другом Челевича, который в свое время был участковым и в тех местах.

Это назначение вызвало массу протестов. Во-первых, Н.Есмантович имел незначительный опыт работы в качестве руководителя, а во-вторых, никаких особых успехов в "Дружбе" не достиг. Однако протесты проигнорировали.

Далее директором опытного рыбхоза "Любань" стал бывший председатель правления колхоза "Бацькаўшчына" Молодечненского района Михаил Есмантович — родной брат Николая Михайловича. Младший Есмантович, кстати, был освобожден от должности председателя за хищения, приписки, злоупотребление служебным положением. Он же привлекался к ответственности за хулиганство. Специального образования Михаил Михайлович не имел. Забегая вперед, скажем, что на новом месте назначенец тоже очень скоро "засветился".

Директором открытого акционерного общества "Любанский сырзавод" назначили Сергея Мицкевича. До этого он работал главным зоотехником в колхозе имени Гуляева, а последние шесть лет был фермером. Сергей Николаевич является мужем родной сестры Есмантовичей.

Председателем правления колхоза "Беларусь" стал А.Мицкевич, который раньше работал заместителем председателя правления колхоза "Калиновка" по подсобному хозяйству. Мицкевичи — родные братья.

Председателем правления колхоза "Уречский" стал Николай Дубина, который до этого работал главным зоотехником в известном уже колхозе "Парижская коммуна". После ухода Макаревича он хотел занять там председательское кресло (не без помощи Ивана Михайловича), но колхозники за его кандидатуру не проголосовали. Тогда Макаревич привел Дубину в Любанский район.

Председателем суда Любанского района стал Сергей Самусевич. Стал не без помощи Макаревича. Дело в том, что в свое время Сергей Петрович тоже был участковым милиционером в упоминавшемся колхозе "Парижская коммуна".

Директором местного предприятия "Вторчермет" был назначен В.Березинский. В 1905 году он был осужден судом Любанского района за взятку с лишением права занимать материально-ответственные должности на пять лет. Но жена В.Березинского — родная сестра жены Челевича. Подобный список можно продолжать. Такая вот "семейная" получилась власть.

Расставив на ключевые посты своих, преданных лично ему людей, Иван Макаревич приступил к работе.

Почти сразу у председателя райисполкома появились две новые служебные машины: одна из последних модификаций "Волги" и четырехдверная "Нива". Так как семья Ивана Михайловича проживала в Солигорском районе, исполкомовский "голова" почти каждый день ездил в Любань на машине либо размещался в одном из домиков Любанского санатория "Рассвет". Ни за размещение не платил — все, [illegible] за счет заведения. А это солидная копейка.

В прошлом году во время тяжелейшей уборочной кампании Макаревич решил отдохнуть и ушел в отпуск. После отпуска, 5 сентября, Иван Михайлович решил отпраздновать свой день рождения, а заодно пополнить семейный бюджет. Всем директорам предприятий и совхозов, председателям колхозов было выслано специальное уведомление, которым их обязывали приготовить в качестве подарка по два-четыре миллиона рублей.

День рождения праздновали с размахом на берегу Солигорского водохранилища, подальше от любопытных глаз. За столом прислуживали официанты столовой комбината строительных материалов. Развлекал публику ансамбль санатория "Рассвет". Веселье продолжалось два дня.

Иван Михайлович почти год выбирал место себе под жилье и проект дома. Наконец место нашли, и дом стали строить. Тоже с размахом. Только на приобретение кровли затратили 3,5 миллиарда рублей. Почти миллиард грохнули на приобретение окон. И это в то время, когда местные учителя уже много месяцев не получали заработную плату.

Взялась за работу и команда Макаревича. В октябре 1997 года заместитель председателя райисполкома Виктор Карпиевич резко "переквалифицировался" в механизатора колхоза имени Суворова. А как иначе, если Виктор Иванович за счет названного хозяйства отдыхал в санатории "Рассвет"?! По этому факту было возбуждено уголовное дело, потом его закрыли, и В.Карпиевич так и остался на своем месте. Очевидно, в качестве примера другим. "Посвященное" ему дело по фактам хищений находилось в производстве Солигорского "антикоррупционного" отдела, которым командует Алексей Пузевич. Дело это было прекращено с передачей в товарищеский суд.

Интересен и такой факт. На одной из сессий районного Совета депутатов Макаревич заявил, что ничего страшного в поступке Карпиевича нет. И что лично он — Иван Михайлович — дал бы еще двадцать путевок своему заместителю.

Но как ни оберегал Макаревич своих назначенцев, они, мягко говоря, надежд не оправдывали. Старший Мицкевич, к примеру, не только не поставил на ноги открытое акционерное общество "Любанский сырзавод", но и привел его к весьма удручающим результатам. В сравнении с 1997 годом это предприятие снизило объем выпускаемой продукции до 93,2 процента.

Нетрудно заметить, что та чехарда с кадрами, которую устроили районные власти, ничего хорошего не принесла. За небольшой промежуток времени были сменены председатели правлений колхозов "Загальский", "Будаўнік", "Бояничи"(тут "голову" успели поменять дважды), "Калиновка", "Кузьмичи", "40 лет Октября" и других. А падение производства от этого только усугублялось.

Одним из атрибутов повседневной деятельности Макаревича и его команды стали запугивания. На последней сессии районного Совета депутатов в прошлом году Иван Михайлович заявил буквально следующее: "Мы не допустим, чтобы на новых выборах в депутаты прошли те, кто умеет красиво говорить. Исполком будет решать, кого народ выберет".

Но предвыборная кампания в районе начала складываться отнюдь не по сценарию Макаревича. Кандидатов в депутаты выдвигали 27 инициативных групп. Районное начальство не на шутку забеспокоилось и решило "прижать к ногтю" и членов групп, и кандидатов. Больше всех мозолил глаза директор Любанского цеха сжиженного газа М.Кругленя. Местные "тузы" связались с его начальством и потребовали, чтобы Кругленю сняли с работы. Его два раза возили в больницу для освидетельствования на предмет алкогольного опьянения. И в обоих случаях Кругленя был трезв как стеклышко. Тем не менее в межрайонном управлении ему предложили или снимать свою кандидатуру, или писать заявление об уходе.

Находились и те, кто говорил:

— Чем вы недовольны! Макаревич дисциплину укрепляет, а кое-кому это не нравится.

Но о каком укреплении дисциплины можно было вести речь, если в прошлом году в том же колхозе "Беларусь" был установлен своеобразный рекорд: 32 раза водители этого хозяйства были задержаны в состоянии алкогольного опьянения за рулем транспортных средств! В колхозе "Чырвоная змена" таких случаев было 28, на экспериментальной базе "Любанская" — 22. А сколько аналогичных фактов по всему району!

Вся эта любаньская экзотика вызвала бурные протесты местных жителей, которые буквально забросали жалобами все контрольные органы. После начала проверок Иван Макаревич подал прошение об отставке...

Сергей НАВОЕВ.

Стоп-кадр

Одним из красивейших зданий города Волковыска станет польская школа, торжественное открытие которой состоялось на днях. Она построена на средства польских властей, а возводили здание, спроектированное гродненскими архитекторами, белорусские строители.

Все предметы в новой школе будут вестись на польском языке.

На снимке: *польская школа в Волковыске.*

Каму патрэбен тады рынак?

У калгасе імя Кірава Браслаўскага раёна адну з апошніх зарплат выдалі... жывымі цялятамі. Сітуацыя знаёмая і тыповая для многіх гаспадарак Віцебшчыны, у якіх няма грошай на разліковым рахунку. Узнікла, аднак, парадаксальная сітуацыя, паколькі назад у гаспадарку ніякую вырашчаную вяскоўцамі скацінку не прымаюць, бо там дрэнная кармовая база напярэдадні зімоўкі. Раней людзі асабліва з-за гэтага не бедавалі, рэзалі сваіх бычкоў і парсючкоў і везлі свежае мяса на рынак, дзе выручалі добрую капейчыну. Цяпер жа дзяржзаказ па пастаўцы мясапрадуктаў за восем месяцаў выкананы ў вобласці толькі на 54,6% і таму спушчана каманда не даваць патрэбных даведак, без якіх не дазволяць гандляваць на рынку. Дзяржаўныя нарыхтоўшчыкі, вядома, мяса прымуць, але апроч страт, яшчэ прыйдзецца чакаць сваіх грошай працяглы час. І нікому, мусіць, няма справы да таго, што тры тутэйшыя гаспадаркі не выдалі заробак у пачатку восені яшчэ за май, дзесяткі іншых не разлічыліся з людзьмі за працу за наступныя месяцы, а сумарна даўгі склалі ўжо 885 мільярдаў рублёў.

Уладзімір ШАЙКОЎ.

Пасля ананімнага паведамлення аб мініраванні былі эвакуіраваныя жыхары 122-кватэрнага дома ў Віцебску

Экстраная эвакуацыя насельніцтва 122-кватэрнага дома па Маскоўскім праспекце, 7 у Віцебску была праведзеная раніцай 4 кастрычніка. Адбылося гэта пасля ананімнага званка ў міліцыю аб замініраванні гастранома "Цэнтральны", які займае ва ўказаным доме ўвесь першы паверх. Эвакуіраваных людзей размясцілі ў кінатэатры "Беларусь". Большасць з іх, аднак, вырашылі, стоячы за ачапленнем, назіраць за дзеяннямі сапёраў і прадстаўнікоў іншых спецслужбаў, якія прыбылі да месца здарэння.

Нарэшце апоўдні быў дадзены адбой: ні ў гастраноме, ні ў жылой частцы дома нічога падобнага на выбуховае прыстасаванне не знойдзена. Услед за сапёрамі і байцамі пажарнай службы вызваліліся і брыгады "хуткай дапамогі".

Медыцынскія наступствы перажытага людзьмі стрэсу пакуль не выявіліся, а ўрон, нанесены з-за прастою буйнейшым у Віцебску гастраномам, яшчэ падлічваецца. Кампетэнтныя органы адшукваюць тэлефоннага тэрарыста. Ёсць запіс ягонага голасу і верагодны псіхалагічны партрэт. Некаторыя падрабязнасці не абвяшчаюцца ў інтарэсах следства.

Леанід СІМАНАЎ.

Истек срок, к которому владельцы транспортных средств должны были застраховать гражданскую ответственность

1 октября истек срок, к которому владельцы транспортных средств в Беларуси обязаны были застраховать гражданскую ответственность, введенную декретом А.Лукашенко 1 июля 1999 года.

Как сообщил БелаПАН генеральный директор Белорусского бюро по транспортному страхованию Петр Кучерин, согласно последним оперативным данным, за три месяца в республике заключено 732 тысячи договоров страхования, или 30,2 процента от общего количества владельцев транспортных средств среди юридических и физических лиц. "Хотелось бы, чтобы было, конечно, больше", — отметил П.Кучерин.

